## ГАСПАДАРЧАЯ СПЕЦЫФІКА АЙЧЫННЫХ ТЫТУЛЯРНЫХ МАЁНТКАЎ ПАВОДЛЕ ДАСЛЕДАВАННЯ І. БАРАНОЎСКАГА (1909)

***Булаты П.Ю.,***
*малады навуковец Інстытута менеджмента спорту і турызму,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Ключавыя словы. Гістарыяграфія, тытулярная традыцыя, магнацкія ўладанні, графства, Хадкевічы.
Keywords. Historiography, titular tradition, magnate possessions, counties, Chadkievičy.

Тытулярныя маёнткі з’явіліся і трывала замацаваліся ў сістэме магнацкага землеўладання Вялікага Княства Літоўскага ў XVI ст., калі ў сацыяльную сістэму былі прыўнесеныя тытулы Святой Рымскай імперыі. Вывучэнне тытулярных маёнткаў (княстваў і графстваў) перыяду XVI–XVIII ст. – актуальная даследчая задача, вырашэнне якой дазволіць па-новаму зірнуць на маёмасныя працэсы Вялікага Княства Літоўскага ў кантэксце культурнай парадыгмы. Вызначэнне ролі і значэння тытулярных маёнткаў у гаспадарчай структуры Вялікага Княства Літоўскага дапаможа адлюстраваць ступень яго інтэграцыі ў агульнаеўрапейскія культурныя працэсы, дзе тытулярная традыцыя трывала замацавалася ў структуры грамадства.

У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі тытулярныя маёнткі Вялікага Княства Літоўскага як комплексная і сістэмная гістарычная з’ява не выносіліся ў асобную даследчую праблему. Выяўленыя напрацоўкі па дадзеным тэматычным напрамку з’яўляюцца каштоўным даследчым матэрыялам.

Мэта прадстаўленага даследавання – прааналізаваць гаспадарчыя асаблівасці тытулярных маёнткаў, вылучаныя польскім даследчыкам Ігнацыям Бараноўскім напачатку XX ст.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з’яўляецца навуковы артыкул аўтарства доктара Ігнацыя Тадэвуша Бараноўскага «Trzy hrabstwa Białoruskie. Studyum historyczno-ekonomiczne» [1], апублікаваны ў 1909 г. на старонках выдання «Przegląd Polski» (прысвечаны навуцы і літаратуры штомесячнік, які выходзіў у Кракаве ў 1866–1914 гг.).

Дзеля аб’ектыўнасці аналізу гістарыяграфічнага тэксту варта звярнуць увагу на асобу і факты навуковай біяграфіі яго аўтара. Ігнацы Бараноўскі (1879–1917) – польскі гісторык, член Гістарычнага таварыства ў Львове. Адукацыю і выхаванне атрымліваў у гімназіях Варшавы, Рыгі і Пецярбурга. Гісторыю вывучаў у Маскоўскім універсітэце (1898–1903), гаспадарчую гісторыю ва ўніверсітэце Лейпцыга (1907–1908). У 1904 г. атрымаў ступень кандыдата (Маскоўскі ўніверсітэт, тэма працы: «Sejmy polski i litewski przed Unią Lubelską»), у 1906 г. – доктара (Ягелонскі ўніверсітэт, тэма дактарату: « praca Podlasie w przededniu Unji Lubelskiej»). У даследаваннях І. Бараноўскі спецыялізаваўся на гісторыі Рэчы Паспалітай эпохі Новага часу, лічыцца адным з піянераў даследаванняў розніцы вясковага ўкладу ў залежнасці ад геаграфічных умоў. Таксама ў кола яго навуковых інтарэсаў уваходзіла праблематыка феадалізму і аграрных спраў перыяду XV–XVIII ст. [2].

У прадстаўленым намі даследаванні выкарыстоўваліся агульналагічныя, агульнанавуковыя і спецыяльныя гістарычныя метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Па сваёй структуры артыкул І. Бараноўскага «Trzy hrabstwa Białoruskie. Studyum historyczno-ekonomiczne» складаецца з уводнай часткі, трох тэматычных раздзелаў, кароткай высновы. Крыніцай даследавання з’явіліся матэрыялы з архіва князёў Чартарыйскіх у Кракаве: інвентары графстваў, кантакты з дзяржаўцамі, рахунковыя кнігі, зборы падымнага падатку, устрой зямель, павіннасці падданых [1, с. 171].

Ва ўводзінах І. Бараноўскі адзначае, што на ўсходнім памежжы Рэчы Паспалітай знаходзіліся абшырныя латыфундыі, якія былі ва ўладанні можнаўладцаў і з’ўляліся крыніцай іх даходу і ўтрымання. Далей аўтар адзначае спецыфіку зямель вылучанага рэгіёна:

Па-першае, аддаленасць ад асноўных шляхоў камунікацыі. Гісторык тлумачыць, што ўсходнія землі Рэчы Паспалітай былі аддалены ад цэнтра дзяржавы і ад гандлёвых дарог, якімі да XVIII ст. былі рэкі з басейна Балтыйскага мора;

Па-другое, усходнія землі часта спусташаліся падчас частых пагранічных войнаў з Маскоўскай дзяржавай.

Грунтуючыся на гэтых двух палажэннях, даследчык робіць выснову, што ўсходнія воласці затрымаліся ў сваім гаспадарчым і сацыяльным развіцці, і як вынік – там быў выпрацаваны тып гаспадарання, адрозны ад тыпу, што прымяняўся ў маёнтках у глыбіні і на захадзе Рэчы Паспалітай. Для таго, каб сфармуляваць бачанне сацыяльна-эканамічнага жыцця ўсходніх зямель, даследчык звяртаецца да стану магнацкіх латыфундый як люстэркі развіцця рэгіёну [1, с. 170].

Асновай выбаркі сталі тры буйныя тытулярныя маёнткі – Шклоўскае, Мышскае і Быхаўскае графства, якія, паводле І. Бараноўскага, адносяцца да гістарычнай Белай Русі займаюць значную частку сучаснай Магілёўскай губерні (па стане на 1909 г.). Гэтыя маёнткі ў пачатку XVII ст. былі ў руках роду Хадкевічаў [1, с. 170–171]. Але ў гэтай частцы даследавання І. Бараноўскі робіць факталагічную памылку. Мышскае графства па стане на 1909 г. уваходзіла ў склад Мінскай губерні і да ўсходніх зямель Рэчы Паспалітай яго аднесці не выпадае, як і да гістарычнай Белай Русі: Мышскае графства змяшчалася на землях гістарычнай Літвы.

Асноўная частка артыкула падзеленая на тры часткі, кожная з іх прысвечана асобнаму графству. З улікам дасяжных крыніц і абранай канцэпцыі даследавання (ацэнка якасці гаспадарчага жыцця маёнтка паводле ацэнкі стану падданых сялян), І. Бараноўскі звяртае ўвагу на наступныя аспекты: памер і склад маёнткаў, гаспадарчая дзейнасць, павіннасці сялян. На іх падставе даследчык вылучае адрозненні графстваў паміж сабой. Звернем увагу на высновы, прыведзеныя даследчыкам па кожным з маёнткаў.

*Шклоўскае графства.* Па стане на XVII ст. Шклоўскае графства складалася з 14 войтаўстваў, у склад якіх уваходзіў сам горад Шклоў, мястэчкі, 161 вёска на якія па стане на 1650 г. прыходзілася 4279 валок зямлі. Але, як адзначае І. Бараноўскі, на такіх вялікіх абшарах зусім была не развітая фальваркавая гаспадарка: у першай палове XVIII ст. у Шклоўскім графстве ўсяго было 3 фальваркі. Разглядаючы павіннасці сялян Шклоўскага графства, І. Бараноўскі адзначае, што нормы паншчыны тут былі досыць нізкія: 10 дзён з валокі (але па факце атрымлівалася ў два разы менш, бо на адну сялянскую гаспадарку прыходзілася ½ валокі). Да таго ж ад паншчыны можна было адкупіцца па тарыфу ад 4 да 10 грошаў за дзень. Але чынш быў высокі: даследчык адзначае, што паміж 1643 і 1750 г. плата павялічылася з 15 да 25 злотых. Наогул, паступленні з чыншу – займалі галоўную долю даходу са Шклоўскага графства [1, с. 171–176].

*Мышскае графства.* Даследчык адразу адзначае, што Мышскае графства моцна адрознівалася ад Шклоўскага. Яно складалася з мястэчка і 17 вёсак, на якія прыходзілася 300 валок ворнай зямлі. Галоўнае адрозненне графства – развітая фальваркавая гаспадарка. У Мышскіх уладаннях было 9 фальваркаў. Бараноўскі адзначае, што фальваркавая гаспадарка вымагала вялікай працоўнай сілы. З гэтым ён звязвае вялікія нормы паншчыны ў Мышскім графстве (у параўнанні са Шклоўскім): напачатку XVIII ст. паншчына складала 10 дзён на тыдзень з валокі (6 дзён мужчынскіх, 4 дні для жанчын) у чыншавых вёсках, у безчыншавых паншчына даходзіла да 8 мужчынскіх і 8 жаночых дзён з валокі. Да таго ж чынш складаў 30 грошаў з валокі ў 1650 г., 50 – у 1692 г. З валок, вольных ад паншчыны, выплачвалася 10 зл. Акрамя таго, сяляне мусілі прыносіць дзякла (прадуктовы падатак). Даход з Мышскага графства ў 1730 г. складаў: ад фальваркаў – 4 990 зл., чыншу – 3 581 зл., арэнда корчмаў – 4 500 зл., дзяклавае збожжа – 1 564 зл. [1, с. 176–178].

*Быхаўскае графства.* Апісанне Быхаўскага графства адрозніваецца ад Мышскага і Шклоўскага. Папярэднія маёнткі, паводле І. Бараноўскага, з’яўляюцца “кепскімі прыкладамі” гаспадарчай дзейнасці, якасць якой адлюстроўвае стан падданых сялян (вялікая норма паншчыны ў Мышскім графстве, чыншавыя абавязкі ў Шклоўскім). Быхаўскае ж графства, наадварот – станоўчы прыклад і карысны гістарычны досвед. Само Быхаўскае графства складалася з 4 мястэчак і 6 войтаўстваў з 42 вёскамі, да якіх у XVIII ст. належала 1533 валокі ворнай зямлі. У графстве было 6 фальваркаў (400 валок зямлі). Даследчык станоўча ацэньвае гаспадарчую палітыку, якую ў маёнтку праводзіў падканцлер Міхал Антоні Сапега (1711–1760) у сярэдзіне XVIII ст. Яе сэнс у тым, каб

скасаваць фальваркі (даследчык агулам крытыкуе фальваркавую сістэмы і лічыць яе не эфектыўнай) і падзяліць землі паміж сялянамі, а таксама вызначыць для кожнай катэгорыі падданых дакладныя ўставы (павіннасці і абавязкі). Далей гісторык адзначае, што слушныя сапежынскія ўставы з'яўляюцца довадам: тытул графства, які насілі быхаўскія ўладанні, абсалютна гарманізаваў з годным станам спраў, якія панавалі ў гэтым маёнтку. І як вынік – Быхаўскае графства ажно да падзелаў Рэчы Паспалітай мела высокі ўзровень абараназдольнасці [1, с. 178–183] (можна адзначыць, што да гэтага аспекту даследчык звяртаецца зусім нечакана).

У канцы І. Бараноўскі робіць выснову, што ва ўсіх графствах фальваркавая гаспадарка знаходзілася на апошнім плане, даходы ва ўладароў маёнткаў галоўным чынам абапіраліся на выкарыстанні прапінацыйнай манаполіі, арэндзе, чыншы і даніне. Даследчык робіць кароткае заключэнне, што адносіны ўладароў Быхава, Мышы і Шклова да іх уладанняў сведчаць аб тым, што яны там не гаспадарылі, а панавалі [1, с. 183]. Пад гэтым І. Бараноўскі мае на ўвазе тое, што ў вылучаных графствах гаспадарчая дзейнасць вялася кепска, уладары атрымлівалі матэрыяльныя рэсурсы, выкарыстоўваючы працу падданых сялян.

**Заключэнне.** Артыкул доктара Ігнацыя Бараноўскага «Trzy hrabstwa Białoruskie. Studyum historyczno-ekonomiczne» з'яўляецца класічнай працай па сацыяльна-гаспадарчай гісторыі Рэчы Паспалітай XVI–XVIII ст. У ім даследчык прытрымліваецца канцэпцыі, згодна з якой сведчаннем эфектыўнай гаспадарчай дзейнасці ў буйным маёнтку з'яўляецца годны стан падданых сялян. Таксама І. Бараноўскі прасоўвае тэзіс, што тытул графства, быў высокім для ўладання і павінен быў гарманізаваць з такім жа высокім узроўнем вядзення гаспадарчых спраў у маёнтку. Як вынік – наяўнасць вялікага рэсурсу для падтрымання абараназдольнасці. Сфармуляваныя тэзісы з'яўляюцца актуальнымі для далейшых даследаванняў тытулярнай традыцыі Вялікага Княства Літоўскага XVI–XVIII ст.

1. Baranowski, I. Trzy hrabstwa białoruskie. Studyum historyczno-ekonomiczne / Ignacy Tadeusz Baranowski // Przegląd Polski. – T. 173. – 1909. – S. 170–183.

2. Śródka, A. Biogramy uczonych polskich : materiały o życiu i działalności członków AU w Krakowie, TNW, PAU, PAN. / Andrzej Śródka, Szczawiński, Paweł. – Cz. 1, Nauki społeczne. – Z. 3, P-Z. – Wrocław : Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 1985. – 717 s.

## СЕЛЬСКИЕ СВЯЩЕННИКИ ПСКОВСКОЙ ЕПАРХИИ ВО ВТОРОЙ ПОЛОВИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX ВЕКА: О ВЗАИМОДЕЙСТВИИ С РАСКОЛЬНИКАМИ

***Воскресенская В.В.,***
*студентка 3-го курса ПсковГУ, г. Псков, Российская Федерация*
*Научный руководитель – **Никитина Н.П.,** канд. ист. наук, доцент*

Ключевые слова. Сельские священники, духовенство, Псковская епархия, раскольники, Псковские епархиальные ведомости.

Keywords. Village priests, clergy, Pskov eparchy, dissenters, Pskov eparchy gazette.

Обращение к теме изучения института сельских священников обусловлено повышением интереса к истории РПЦ и духовенства, в частности, к их синодальному периоду. Интерес возникает и к сельским священникам, как лицам непосредственно взаимодействующими с прихожанами, сельское приходское духовенство самая многочисленная категория служителей РПЦ. Основная масса служащего духовенства была рассредоточена именно по сельской местности, при этом здесь на сельского священника приходилось намного больше прихожан, нежели в городе, всего на 1860 г. священников в Российской империи было 37,8 тыс. чел., в 1904 – 47,4 тыс. [1, с.379]. Изучением данной проблематики занимались Миронов Б.Н. [1], Леонтьева Т. Г [2].